# РАЗВІЦЦЁ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ БЯРЭЗІНШЧЫНЫ Ў ПОЛІ ЗРОКУ СЯРГЕЯ ЛІНГА

**Шэсць з 22 гаспадарак Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці завяршылі жніво. Вялікай радасці ад дажынак, аднак, мясцовыя земляробы не адчуваюць. Прычына гэтага — вельмі ўжо сціплыя паказчыкі па ўраджайнасці: на круг у сярэднім па раёну механізатары намалочваюць усяго крыху больш чым 11 цэнтнераў збожжа. Як пасля вайны.**

Аб гэтым і многім іншым, што стрымлівае сёння развіццё сельскагаспадарчага патэнцыялу Бярэзіншчыны, ішла грунтоўная размова ў час візіту ў раён 18 жніўня прэм'ер-міністра Сяргея Лінга. У паездцы кіраўніка ўрада суправаджаў старшыня Мінскага аблвыканкама Мікалай Дамашкевіч.

Знаёмячыся са становішчам спраў, прэм'ер-міністр аб'ектыўна ацаніў магчымасці тутэйшага аграпрамысловага комплексу. Прыродная беднасць зямель, недахват тэхнікі, фінансавых сродкаў, іншыя аб'ектыўныя цяжкасці — усё гэта, вядома, стрымлівае развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці. Разам з тым было падкрэслена, што нават у няпростых умовах неабходна імкнуцца працаваць як мага больш мэтанакіравана і эфектыўна. Добра што па прыклады, як кажуць, хадзіць далёка не трэба. Скажам, пры ўсіх тых жа цяжкасцях у калгасе «Ленінскія дні» змаглі атрымаць ледзь не ў два разы больш збожжа з гектара, чым у сярэднім па раёну. А ў калгасе «Любушанскі» да гэтага часу нарыхтавалі па 9,3 цэнтнера кармавых адзінак на ўмоўную галаву жывёлы, тады як у сярэднім па раёну гэты паказчык складае ўсяго 4,9 цэнтнера кормаадзінак. Абедзве гэтыя гаспадаркі знаходзіліся на маршруце руху картэжа прэм'ер-міністра.

Сяргей Лінг наведаў таксама тутэйшае міжгаспадарчае прадпрыемства «Кастрычнік» па вытворчасці насення збожжавых культур. Ён застаўся задаволены тым, як вырашаюцца тут пытанні забеспячэння насеннем гаспадарак раёна. У той жа час прэм'ер-міністр звярнуў увагу на неабходнасць актывізацыі гэтай работы, падняцці яе на больш якасны ўзровень.

У ходзе сваёй паездкі Сяргей Лінг звярнуў увагу кіраўніцтва раёна на неабходнасць своечасовага і якаснага правядзення азімай сяўбы, уборкі бульбы, заканчэння нарыхтоўкі кармоў і надзейнай падрыхтоўкі жывёлагадоўчых фермаў да зімы.

Кіраўнік урада азнаёміўся таксама з сацыяльнай інфраструктурай раёна. З нецярпеннем чакалі яго ў летнім аздараўленчым лагеры «Папараць-кветка» і Любушанскай сярэдняй школе. Прэм'ер-міністру было далажана аб выніках летняга аздараўленчага сезона і падрыхтоўцы да новага навучальнага года.

**Алег ШВЕДАЎ, БЕЛТА.**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ